**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**«Гоцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа Салігорскага раёна»**

**Педагагічны праект «Працоўнае выхаванне дашкольнікаў сродкамі народнай педагогікі»**

# Дыдактычная гульня «Загадкі аб прадметах традыцыйнага побыту беларусаў”

<table>
<tr><th>№ п.п.</th><th>Аб’ект</th><th>Прыклад</th></tr>
<tr><td>1.</td><td colspan="2">Абрус.<br>1.Стаіць сасна, на сасне лён, на льне жыта (стол, абрус, хлеб).<br>2.Білі мяне, білі, калацілі, на кавалкі рвалі, па полі цягалі, на ключ замыкалі і на стол паслалі (абрус).<br></td></tr>
<tr><td>2.</td><td colspan="2">Агарод.<br>Таўстунчык паласаты на лузанцы багаты.<br>Абжыўся ў агародзе, а хвост вісіць на плоце (гарбуз).<br></td></tr>
</table>

| | |
|---|---|
| | |
| 3. | **Пограб.**<br>Бяздонны ў пана жывот, увабраў увесь агарод<br>  |
| 4. | **Вароты.**<br>Не жывыя, а пішчаць без злосці кожны раз, як прыязджае хтосьці.<br> |
| 5. | **Вілкі.**<br>Рагаты, ды не бык, яду бярэ, а не сыты, людям падае, а сам у кут ідзе.<br> |
| 6. | **Вятрак.**<br>Што за птах у краі любіць вецер, збожжа,<br>Крыламі махае, а ўзляцець не можа. |

| | |
|---|---|
| |  |
| 7. | **Вядро.**<br>За вушы два канцы дугі трымаюць мора берагі (вядро)<br> |
| 8. | **Дзяжа.**<br>Страх абпрэчыўшы, скажы,<br>Што такое пыхкае ў дзяжы –<br>Пульхна-наздраватае,<br>На муку багатае (цеста)<br> |
| 9. | **Ночвы** (перавернуты дном да верху).<br>У аднаго парсюка два лычы.<br> |
| 10. | **Міска.**<br>Каля ямы ўсе з кіямі<br> |
| 11. | **Лыжка**<br>Не разыначка (ізюм) я, а мяне ўсе смакуюць,<br>не дзяўчыначка я, а мяне ўсе цалуюць.<br> |

| | |
|---|---|
| | |
| 12. | **Дрывотня.**<br>Шчыруюць на дрывотні сёстры<br>Над сухастою возам:<br>Адна сястра з зубамі вострымі,<br>Другая – з вострым носам (піла і сякера).<br> |
| 13. | **Збан, гарлач.**<br>Быў на капальні, быў на таптальні, быў на кружары,<br>быў на пажары (гліняны посуд).<br>*Ад аўтара:* кружар – ганчарны круг.<br> |
| 14. | **Калёсы, воз.**<br>Два браты бягуць, а два даганяюць і дагнаць не могуць.<br> |
| 15. | **Каса.**<br>Рыбка бялява хвосцікам віляла, лясы ламала, горы стаўляла<br> |
| 16. | **Сякера**<br>Без работы яна пацее і ржавее.<br> |
| 17. | **Свярдзёлак.**<br>1.Мой брат Кандрат праз сцяну прайшоў,<br>мяшочак грошай знайшоў (заробак прынёс).<br>2.Жук стальны навылет, зверху ўніз<br> |

| | |
|---|---|
| | Дуб пpагрыз і на волю вылез |
| 18. | **Кош.**<br>Ножак ён не мае,<br>Ён з адною ручкай,<br>А грыбы збірае<br>З бабкай і ўнучкай (кош).<br> |
| 19. | **Верацяно.**<br>Чым я больш вярчуся, тым я больш таўсцею.<br> |
| 20. | **Кросны.**<br>Жоўты парсючок між загарадак бегае (чаўнок і ніты)<br> |
| 21. | **Кубелец.**<br>Як называецца майстар-умелец,<br>які выштукоўвае кадаўб,<br>кадушку і кубелец (бондар).<br> |
| 22. | **Жорны.**<br>На камені камень ляжыць,<br>Што за белы ручай<br>З-пад тых камянёў бяжыць?<br> |
| 23. | **Куфар.**<br>Надзеў на вяселле прыгожы жупан,<br>На возе рассеўся і едзе як пан.<br> |
| 24. | **Ложак.**<br>Чатыры нагі маю, але не звер,<br>Пух і пер’е маю, але не птах,<br>Цела маю, ды не чалавек.<br> |

| | |
|---|---|
| 25. | **Ручнік.**<br>Трапечацца ў руках, як белакрылы птах,<br>Маркоціцца тады, калі няма вады.<br> |
| 26. | **Сані.**<br>Бягуць у лясок, задраўшы насок<br>  |
| 27. | **Сноп, зжаты сярпом.**<br>Сто братоў адным адным поясам падпяразаны<br>  |
| 28. | **Хата.**<br>Поле шкляное, а межы дрывяныя (акно у хаце).<br> |
| 29. | **Чапяла.**<br>Цыган цыганку за грыву павалок.<br> |

| | |
|---|---|
| 30. | **Скавародка, подмазак– здор, блін з грэцкай мукі.**<br>Жалезны ток, свіны падскок, а грэцкі пасад.<br> |
| 31. | **Плуг.**<br>Стальны пёс у зямлю ўрос.<br> |
| 32. | **Барана.**<br>Зубы мае, ане жуе і не глытае.<br> |
| 33. | **Сіта.** Пад ліпавым кустом мяцеліца мяце.<br> |
| 34. | **Малаток.**<br>Сам драўляны, а галава жалезная.<br> |

| | |
|---|---|
| 35. | **Геблік, рубанак.**<br>Нібыта фокуснік стужкі, ён выкідае з рота стружкі.<br>  |
| 36. | **Вілы, сахор**.<br>Стаіць паніч дагары нагамі<br> |
| 37. | **Колас**<br>Залацісты і вусаты.<br>У ста кішэнях  сто зярнятак.<br> |
| 38. | **Печ**<br>Яна галодная – хата халодная.<br>Яна пад’ела – у хаце пацяплела (печ).<br> |